# НавінЫ

БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 19 (52) 28 чэрвеня 2001 г.

# Домаш пачынае

**21 чэрвеня ў выбарчым штабе Сямёна Домаша адбылася прэсавая канфэрэнцыя, на якой прысутнічалі журналісты айчынных і замежных СМІ. Нагодай для яе правядзеньня стаў пачатак кампаніі па зборы подпісаў. У ініцыятыўнай групе Домаша 3695 чалавек. Яна моцная арганізацыйна, асабліва ў рэгіёнах. Гэта адрознівае С. Домаша ад астатніх прэтэндэнтаў, якія робяць стаўку на Менск і буйныя гарады. У складзе групы прадстаўнікі шырокай грамадзкасьці – партыяў, грамадзкіх рухаў і аб'яднаньняў, прафсаюзных арганізацыяў.**



Сямён ДОМАШ

С. Домаш заявіў, што ягоная каманда знаходзіцца ў стадыі фармаваньня, але некаторыя імёны былі названыя ўжо на прэсавай канфэрэнцыі. Так, згоду працаваць з С. Домашам і ўсяляк яго падтрымліваць далі Людміла Карпенка, рэжысэр Юры Хашчавацкі, дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі 13 скліканьня Уладзімер Кудзінаў, палітык Аляксандар Дабравольскі, лідэр "Саюзу праваслаўнай моладзі" Андрэй Петравых.

Камэнтуючы факт рэгістрацыі 22 ініцыятыўных групаў, С. Домаш сказаў, што за сем гадоў магла выстраіцца й не такая чарга, бо шмат людзей прагне пераменаў. Але ў гэтым сьпісе Домаша насьцярожвае суседзтва дзьвюх асобаў – А. Лукашэнкі й З. Пазьняка. Сямён Домаш выказаў насьцярожанасьць фактам рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Зянона Пазьняка. Ён заявіў, што паводле ўсіх існуючых юрыдычных правілаў, ініцыятыўная група Пазьняка не магла быць зарэгістраваная з той прычыны, што прэтэндэнт ужо некалькі гадоў жыве за межамі Беларусі. Як падкрэсьліў Сямён Домаш, у гэтым выпадку відавочнае разыходжаньне дзеяньняў Цэнтравыбаркаму і існуючага заканадаўства, і такі сцэнар выгодны Лукашэнку. "Вялікая частка людзей не падтрымлівае разбуральную палітыку Лукашэнкі. Зразумела, што яму трэба чымсьці "прыкрыць" сваю палітыку разбурэньня. Падчас выбарчай кампаніі Пазьняк патрэбны Лукашэнку", – сказаў С. Домаш. Ён заявіў, што час разбуральнікаў ужо мінуў і Беларусі патрэбны новы лідэр, які б займаўся стваральнай дзейнасьцю.

Адказваючы на пытаньне аб магчымых зьменах у стратэгіі "пяцёркі" дэмакратычных кандыдатаў, Домаш зазначыў, што агульная мэта аб'яднаньня пяці палітыкаў – зьмена існуючага рэжыму. "Каб дасягнуць гэтай мэты, я ўключыўся ў выбарчую кампанію. Калі на мяне выпадзе роля адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў, я гатовы прыняць гэтую ролю ў поўнай меры і поўным аб'ёме, які будзе патрэбны", – сказаў Сямён Домаш. Прагучала пытаньне і аб стаўленьні да Міхаіла Марыніча, які далучыўся да прэзыдэнцкай гонкі. "Ня выключаная магчымасьць, – заўважыў сп. Домаш, – што Марыніч будзе нашым партнэрам па супольнай барацьбе супраць гэтага рэжыму. Я спадзяюся, што ён увойдзе ў склад шырокай кааліцыі, якая будзе супрацьдзейнічаць рэжыму Лукашэнкі".

На пытаньне аб магчымым дачыненьні беларускіх уладаў да зьнікненьняў вядомых людзей, С. Домаш зазначыў, што паказальным зьяўляецца маўчаньне Генэральнага пракурора В. Шэймана пасля вядомай заявы сьледчых Петрушкевіча і Случака. Гэта, паводле словаў Домаша, наводзіць грамадзтва на пэўныя думкі. Ён падкрэсьліў, што адно з рэальных "дасягненьняў" уладаў за 7 гадоў кіраваньня А. Лукашэнкі – гэта зьяўленьне ў Беларусі групы забойцаў, якія займаюцца зьнішчэньнем небясьпечных для рэжыму людзей.

Нечаканы візыт А. Лукашэнкі ў Маскву 20-21 чэрвеня С. Домаш патлумачыў тым, што "кіраўніцтву Расеі даўно надакучылі выбрыкі беларускага прэзыдэнта, і яму, хутчэй за ўсё, прапанаўвалі зручную пасаду ў рамках "Саюзу", каб спыніць увесь гэты балаган у Беларусі."

**Прэсавая група**
**Сямёна ДОМАША**

vytoki.net

*ЗАЯВА*
*Ўправы Партыі БНФ*

## Аб незаконным фармаваньні тэрытарыяльных выбарчых камісіяў

З 8 па 17 чэрвеня 2001 г. мусіла адбывацца вылучэньне, а з 18 па 20 чэрвеня – фармаваньне тэрытарыяльных выбарчых камісіяў. Гэты этап кампаніі па выбарах Прэзыдэнта ўладамі з маўклівай згоды Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў быў праведзены з грубымі парушэньнямі выбарчага заканадаўства. Палітычныя партыі, іншыя грамадзкія аб'яднаньні, працоўныя калектывы, грамадзяне не былі праінфармаваныя пра тэрміны і парадак вылучэньня ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі.

Паводле зьвестак Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, беларускіх праваабарончых арганізацыяў пры вылучэньні і фармаваньні тэрытарыяльных камісіяў, улады неаднаразова парушалі беларускае заканадаўства і міжнародныя пагадненьні. Гэта – непрыняцьцё пратаколаў па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, рэгістрацыя пратаколаў пад неадпаведнымі нумарамі, адміністрацыйны ціск на кандыдатаў у сябры тэрытарыяльных камісіяў і грамадзянаў, якія іх падтрымалі, перасьлед грамадзянаў з боку МУС і КДБ. Само фармаваньне тэрытарыяльных камісіяў у большасьці выпадкаў адбывалася на закрытых паседжаньнях выканкамаў і прэзыдыюмаў саветаў. Больш за 100 сябраў Партыі БНФ, якія былі вылучаныя ў сябры тэрытарыяльных камісіяў, у камісіі ня трапілі. Акрамя таго, у склад камісіяў не ўвайшоў ніводзін прадстаўнік дэмакратычных палітычных партыяў і дэмакратычных грамадзкіх арганізацыяў. Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі былі сфармаваныя зь людзей, залежных ад выканаўчай улады. Пры гэтым ўлады недакладна выконвалі дзеючае заканадаўства пры вылучэньні гэтых людзей.

Управа Партыі БНФ выказвае рашучы пратэст супраць фактаў парушэньня беларускага заканадаўства, аднабаковага фармаваньня выбарчых камісіяў, патрабуе роспуску камісіяў і іх фармаваньня згодна зь дзеючым заканадаўствам.

25 чэрвеня 2001 г.



Прэтэндэнту ў кандыдаты ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь сп. Лукашэнку
Старшыню Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь сп. Ярмошыну
Кіраўніку Адміністрацыі Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь сп. Мясьніковічу

# Адкрыты ліст

З 8 па 17 чэрвеня 2001 г. згодна з заканадаўствам мусіла адбывацца вылучэньне кандыдатаў у тэрытарыяльныя камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. Гэты вельмі важны этап правядзеньня сёлетняй палітычнай кампаніі (бо менавіта на падставе пратаколаў тэрытарыяльных камісіяў прымаецца рашэньне Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў (далей ЦВК) аб рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь, а пасьля падводзяцца вынікі ўсенароднага галасаваньня) дзякуючы вашай дзейнасьці і бязьдзейнасьці ЦВК і яе старшыні сп. Ярмошынай (якая паводле зьвестак Беларускага Гельсынскага камітэту незаконна займае сваю пасаду) быў практычна правалены. Беларускае грамадзтва не было праінфармаванае пра тэрміны й парадак вылучэньня ў тэрытарыяльныя камісіі і формы адпаведных дакумэнтаў. Дзеля таго каб правесьці ў камісіі неабходных вэртыкалі людзей на папярэдне зробленых уладамі сьпісах, выканкамы пайшлі на грубейшыя парушэньні беларускага заканадаўства – непрыняцьцё пратаколаў па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, рэгістрацыю пратаколаў пад неадпаведнымі нумарамі, адміністрацыйны ціск на альтэрнатыўных кандыдатаў у сябры тэрытарыяльных камісіяў і грамадзянаў, якія іх падтрымалі, перасьлед з боку МУС і КДБ. Акрамя таго, актывісты палітычных партыяў не пацьвярджаюць фактаў правядзеньня сходаў працоўных калектываў, на падставе пратаколаў якіх вэртыкаль фармавала камісіі. Тым ня менш, нягледзячы на рэпрэсіі і парушэньні закону выканаўчымі ўладамі, па лініі Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў (які аб'ядноўвае большасьць ад зарэгістраваных Мінюстам палітычных партыяў) з дапамогай грамадзкіх арганізацыяў было падрыхтавана згодна зь дзеючым заканадаўствам больш за 600 кандыдатаў у сябры тэрытарыяльных камісіяў дзеля таго, каб выбары Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь былі дэмакратычнымі, свабоднымі і празрыстымі.

На паседжаньнях выканкамаў, якія адбываліся з 18 па 20 чэрвеня, за рэдкім выняткам, усе кандыдатуры, падрыхтаваныя Міжпартыйным цэнтрам, не ўвайшлі ў склад тэрытарыяльных камісіяў па фармальных прычынах альбо наагул без указаньня прычынаў. Такім чынам, прэзыдэнцкай вэртыкальлю была створаная сыстэма па фальсыфікацыі волевыяўленьня беларускага народу. Яшчэ раз было прадэманстравана ўсяму сьвету, што сёньняшні рэжым цудоўна разумее ўсю хісткасьць свайго становішча і ня верыць, што беларускія грамадзяне могуць прагаласаваць за Лукашэнку. Практычна ўлады пайшлі на сілавы варыянт ужо на пачатку кампаніі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

Акрылёная "перамогай" пры фармаваньні тэрытарыяльных выбарчых камісіяў, вэртыкаль такім жа чынам зьбіраецца правесьці падкантрольных сабе людзей і ў склад участковых камісіяў. У выніку Лукашэнка атрымае магчымасьць непасрэдна кіраваць усёй сыстэмай выбарчых камісіяў і будзе мець велізарнейшую перавагу над іншымі кандыдатамі ў Прэзыдэнты.

Каб рэалізаваць права беларускага народу на выбары Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь у найбліжэйшы час неабходна распусьціць тэрытарыяльныя камісіі і сфармаваць іх нанова, без парушэньняў беларускага заканадаўства.

Дасягнуць гэтага магчыма толькі празь перамовы прадстаўнікоў прэтэндэнта ў кандыдаты ў Прэзыдэнты А. Лукашэнкі і прадстаўнікоў ініцыятыўных групаў па вылучэньні іншых кандыдатаў у Прэзыдэнты.

Калі фактам парушэньняў беларускага заканадаўства пры фармаваньні тэрытарыяльных камісіяў ня будзе дадзеная належная ацэнка, то адказнасьць за гэта пакладзецца цалкам на прэтэндэнта ў кандыдаты ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнку і пазбавіць яго нават той кволай падтрымкі, якую ён мае ў беларускім грамадзтве.

Міжпартыйны цэнтар па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў са свайго боку, пры ўмове вяртаньня працэсу фармаваньня камісіяў у рэчышча законнасьці, здольны прапанаваць да 50% сябраў выбарчых камісіяў усіх роўняў. Іншых мэханізмаў для рэалізацыі канстытуцыйнага права беларускага народу на дэмакратычныя выбары Прэзыдэнта сёньня ў нашай краіне няма.

**Каардынатар Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў**
**Вячаслаў СІЎЧЫК**
**22 чэрвеня 2001 г.**
**г.Менск**

vytoki.net

# Фальсыфікацыя. Акт I

**3 600 прадстаўнікоў, вылучаных палітычнымі партыямі й грамадзкімі аб'яднаньнямі ў камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь у якасьці сябраў тэрытарыяльных камісіяў, не зацьверджаны ніводзін. Гэта сьведчыць пра падкрэсьленае нежаданьне афіцыйных уладаў правесьці сапраўды дэмакратычныя, адкрытыя выбары, стварыць празрыстасьць выбарчага працэсу ў краіне.**

Грамадзянская ініцыятыва "Незалежнае назіраньне" а 15-й гадзіне 21 чэрвеня ў памяшканьні Таварыства беларускай мовы ладзіла прэсавую канфэрэнцыю, прысьвечаную вынікам фармаваньня тэрытарыяльных выбарчых камісіяў па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

Першым узяў слова сустаршыня грамадзянскае ініцыятывы "Незалежнае назіраньне" сп. Мечыслаў Грыб. Ён адзначыў, што "мы, як наглядальнікі, зацікаўленыя, каб камісіі былі створаныя дэмакратычным шляхам, насілі плюралістычны характар і прадстаўлялі розныя слаі насельніцтва". Пасьля чаго заўважыў, што нягледзячы на вялікі аб'ём зробленай працы і вялікую колькасьць вылучаных прадстаўнікоў ад дэмакратычных палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў у якасьці сябра тэрытарыяльных камісіяў ня быў зацьверджаны ніводзін. З чаго зрабіў выснову: "Партыя ўлады ў чарговы раз зрабіла вельмі вялізны крок да прызнаньня выбараў нелегітымнымі. Толькі па фармаваньні камісіяў". І напрыканцы зазначыў: "Неабходна імкнуцца правесьці сваіх людзей ва ўчастковыя выбарчыя камісіі. А тыя вынікі, што мы ўжо маем сёньня, абскардзіць ў пракуратуры, што можа паспрыяць таму, каб улада перагледзіла іх, пайшоўшы на правядзеньне законных выбараў".

Прадстаўнікі Беларускага Гельсынскага камітэту Ілона Бондарава і Зьміцер Якушэўскі зазначылі, што па ўсёй краіне мясцовыя аддзяленьні БГК падалі скаргі ў пракуратуру, каб па фактах нядопуску назіральнікаў і прэсы на паседжаньні па фармаваньні выбарчых камісіяў былі прынятыя адэкватныя меры да парушальнікаў закону, і па якіх пракуратурай ужо ўзбуджаныя крымінальныя справы й вынесеныя пратэсты на прынятыя рашэньні па фармаваньні складу тэрытарыяльных камісіяў. Такі ж зварот накіраваны да старшыні ЦВК. Яшчэ было зазначана, што ніводны з 225 чалавек, прадстаўнікоў дэмакратычных арганізацыяў, што вылучаліся ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, і за лёсам якіх сачылі рэгіянальныя аддзяленьні БГК, ня быў прыняты ў склад камісіяў.



*Л. Ярмошына на «варце» закону.*

Пасля чаго зрабілі акцэнт на непасрэдныя парушэньні закону, што адбываліся падчас фармаваньня камісіяў.

Наступным слова меў Вячаслаў Сіўчык, каардынатар Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў. Выступоўца зазначыў, што, на вялікі жаль, рэжыму удалося сфармаваць сыстэму выбарчых камісіяў цалкам падкантрольную сабе і адсекчы ўсіх тых, хто йшоў у якасьці альтэрнатывы людзям, якія ўжо неаднаразова фальсыфікавалі выбары. Таксама зазначыўшы, што "ўжо сёньня, нагул, пад пагрозай правядзеньне выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. А таму неабходна выкарыстаць усе мэханізмы, усе нашыя магчымасьці для таго, каб патрабаваць расфармаваньня тэрытарыяльных выбарчых камісіяў, якія створаныя абсалютна незаконна і з масай парушэньняў".

**Прэсавая служба грамадзянскай ініцыятывы "Незалежнае назіраньне"**

# Сямён Домаш цікавіцца маладзёвай культурай

21 чэрвеня ў Менскім клюбе "Танэль" адбылося адкрыцьцё адборачнага туру маладых гуртоў на "Басовішча-2001". За права паехаць на фэст змагаліся гурты "Імпэт" (Менск), "Правакацыя" (Менск), "Голая манашка" (Менск), "Мэтро" (Жодзіна), "Pet Nihil" (Горадня), "Анархіс" (Столін) і інш. У адкрыцьці фэсту прынялі ўдзел і зоркі беларускага року "Zet", "Зьніч", "Happy Face".

Сам фэстываль праводзіцца ўжо 12 год у ваколіцах невялікага гарадку на Беласточчыне польскай арганізацыяй "Беларускае аб'яднаньне студэнтаў". Арганізацыяй адборачных тураў у Беларусі вось ужо другі год запар займаецца БМАgroup.

Нечаканасьцю для больш як 200 маладых людзей стала зьяўленьне ў залі аднаго з магчымых кандыдатаў у прэзыдэнты Сямёна Домаша. Свой удзел у мерапрыемстве ён растлумачыў увагай да моладзевай культуры, жаданьнем ведаць, чым цікавіцца моладзь. "Ад сёньняшняй моладзі залежыць нашая будучыня. Менавіта яны будуць будаваць яе. Таму для мяне вельмі важна ведаць, чым яны жывуць і як зьмяніць іхнае жыцьцё да лепшага, – пракамэнтаваў Домаш сваё зьяўленьне. – А на мерапрыемстве мне вельмі спадабалася. Тым больш што я пабачыў тут Лявона Вольскага, падабаецца мне апошні альбом NRM "Тры чарапахі", Вячаслава Кораня з "Ulis", люблю слухаць іхны альбом "Падарожжа" па дарозе з Горадні на Менск".

**Алеся ВАЛЫНЧУК**



vytoki.net

# Людзі ў камісіі – правераныя кадры

**18 чэрвеня 2001 г. у Баранавічах адбылося сумеснае пасяджэньне гарвыканкаму і прэзыдыюму гарсавету па фармаваньні складу гарадзкой выбарчай камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. У якасьці назіральніка на ім прысутнічаў старшыня Баранавіцкай філіі ПЦ "Вясна Сяргей Гоўша.**

Прыняўшы колькасны склад камісіі ў 13 чалавек, дэмакратыя скончылася. Далей быў зачытаны даўно падрыхтаваны сьпіс правераных асобаў, якія добра папрацавалі на ўладу на сёлетніх сакавіцкіх выбарах у "палатку". У складзе камісіі 9 жанчынаў, да якіх дадалі двух пэнсіянэраў-камуністаў. Ніводзін зь дзевяці прадстаўнікоў ад дэмакратычных партыяў і арганізацыяў у камісію ня ўключаны й іхныя кандыдатуры нават не разглядаліся. Як было заяўлена – усе яны парушылі арт. 35 Выбарчага кодэксу (нібыта з парушэньнямі аформленыя дакументы).

Што тычыцца грамадзкай арганізацыі БНФ "Адраджэньне", дык было заяўлена, што яна не прайшла перарэгістрацыю. Сапраўды, у выканкамаўскім журнале рэгістрацыі грамадзкіх арганізацыяў апошнім годам рэгістрацыі стаяў 1995-ы. Насамрэч апошні год рэгістрацыі – 2001-ы. У БНФ "Адраджэньне" ёсьць і рашэньне Баранавіцкага гарвыканкаму за №628 ад 25.04.2000 г., і пасьведчаньне аб рэгістрацыі, а копія гэтага пасьведчаньня была прыкладзеная да выпіскі з пратаколу. Супраць гарвыканкаму БНФ "Адраджэньне" мае намер узбудзіць крымінальную справу.

Астатнія партыі й грамадзкія арганізацыі таксама спрабуюць разабрацца з парушальнікамі закону.

Такая самая сытуацыя і з фармаваньнем Баранавіцкай раённай камісіі.

**Сяргей ГОЎША**

# "Ігуменскі Шлях"

**23 чэрвеня ў Ігумене (Чэрвені) грамадзкасьць ушанавала памяць палітвязьняў, расстраляных органамі НКВД на пачатку вайны ў 1941 г. (а ўсе крымінальнікі былі выпушчаныя).**



Сёлета – 10 гадоў як ладзіцца шэсьце. Хоць гэтым разам улады яго забаранілі, даўшы дазвол толькі на мітынг, тым ня менш, людзі не пабаяліся ды зноў прайшлі апошнім шляхам закатаваных, каб засьведчыць, што памяць забараніць нельга.

Шэсьце, якое традыцыйна адбываецца ад турмы да месца расстрэлу палітвязьняў у ігуменскім лесе, суправаджалі тры машыны з супрацоўнікамі "органаў", якія фільмавалі прысутных на відэакамэру. За горадам калёна разгарнула бел-чырвона-белыя сьцягі і без асаблівых перашкодаў з боку міліцыі дайшла да жалобнага месца ўва ўрочышчы Цагельня, дзе ўзьведзеныя мэмарыяльныя знакі й крыжы. Там удзельнікі "Ігуменскага Шляху", сярод якіх былі прадстаўнікі зь Літвы й Польшчы, усклалі кветкі.

**Алесь КАНАШЭЎСКІ**

# Баранавічы цікавяцца ходам прэзыдэнцкай кампаніі

**22 чэрвеня старшыня БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Вінцук Вячорка быў запрошаны баранавіцкай незалежнай газэтай "Intex-press" на гарачую лінію са сваімі чытачамі, якая была анансаваная ў газэце.**

На працягу дзьвюх гадзінаў жыхары гораду мелі магчымасьць патэлефанаваць у рэдакцыю і задаць кіраўніку Фронту ўсе пытаньні, якія іх цікавілі. Людзі тэлефанавалі надзвычай ахвотна: за абмежаваны час гарачай лініі Вінцук Вячорка адказаў на некалькі дзясяткаў пытаньняў. Яны датычылі выбараў, шанцаў выхаду на адзінага кандыдата, а таксама ролі Фронту ў выбарчай кампаніі, стаўленьня Фронту да розных прэтэндэнтаў і контразахадаў БНФ у адказ на прапагандысцкія крокі рэжыму.

Акрамя таго, у Баранавічах адбыліся сустрэчы кіраўніка БНФ з удзельнікамі групаў збору подпісаў, сябрамі сетак па назіраньні і з актывам Фронту.

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**



# EDS патрабуе ад беларускіх уладаў спыніць перасьлед маладафронтаўцаў

25 чэрвеня на паседжаньні ў Стакгольме Эўрапейскія Дэмакратычныя Студэнты прынялі зварот да беларускіх уладаў у сувязі з апошнімі рэпрэсіямі супраць актывістаў Маладога Фронту. 26 чэрвеня зварот быў дасланы міністру юстыцыі Беларусі Генадзю Варанцову, міністру адукацыі Васілю Стражаву й старшыні Менгарвыканкаму Міхаілу Паўлаву.

EDS – студэнцкі саюз Эўрапейскае Народнае Партыі (дарэчы, гэтая арганізацыя яднае ў сваіх шэрагах дэмакратычную, кансэрватыўную і лібэральную моладзь эўрапейскіх краінаў).

У звароце выказанае абурэньне EDS апошнім фактам перасьледу актывіста Маладога Фронту Дзяніса Мархатка, які за ўдзел у маладафронтаўскай акцыі быў выключаны зь менскай школы №86. Таксама ў звароце ўтрымліваецца спасылка на Канстытуцыю РБ, дзе гарантаваная свабода сходаў, перакананьняў, іх вольнае выражэньне, і заклік спыніць антыканстытуцыйныя дзеяньні. Заява падпісаная старшынём EDS Густафам Каспарсанам.

Дадамо, што Беларусь у EDS прадстаўленая менавіта Маладым Фронтам. Якраз у гэтыя дні, напрыканцы чэрвеня – на пачатку ліпеня, Малады Фронт прымае афіцыйны візыт кіраўніцтва EDS у Менску, а 27 ліпеня старшыня міжнароднай камісіі МФ Сяржук Лісічонак зьяжджае ў Вільню для папярэдняе сустрэчы з EDS.

Асноўнае пытаньне, якое будзе абмяркоўвацца ў маючых адбыцца сустрэчах Маладога Фронту з EDS – выбары ў Беларусі, удзел моладзевых арганізацыяў у выбарчай кампаніі і далейшае супрацоўніцтва з Маладым Фронтам.

**Марына КНЫШ**



vytoki.net

# Маргарэт Тэтчар зычыць беларусам перамогі

**7 чэрвеня 2001 году ў Вялікае Брытаніі адбыліся нацыянальныя й мясцовыя выбары. На запрашэньне Кансэрватыўнае партыі сябра Сойму, сакратар міжнароднай камісіі Партыі БНФ Аляксей Янукевіч і намесьнік старшыні МК Маладога Фронту Андрусь Саротнік знаходзіліся з 27 траўня па 10 чэрвеня на поўдні Ангельшчыны, у акрузе New Forest East, дзе мелі магчымасьць назіраць за працай штабу і нават удзельнічаць у перадвыбарчай кампаніі кандыдата ад Кансэрватыўнае партыі Джуліяна Льюіса, а таксама назіраць за падлікам галасоў і падвядзеньнем вынікаў выбараў.**




*Ля офісу Кансэрватыўнай партыі ў акрузе New Forest East*

У Вялікае Брытаніі існуе клясычная мажарытарная выбарчая сыстэма, дзе "пераможца забірае ўсё". Сябрам парлямэнту становіцца той кандыдат, які набірае простую большасьць галасоў. Урад цалкам фармуе тая партыя, што мае большасьць месцаў у парлямэнце. Прэм'ер-міністрам становіцца лідэр партыі, якая атрымала перамогу на выбарах. Барацьба за ўладу вядзецца паміж дзьвюма асноўнымі партыямі – Кансэрватыўнай (правыя) і Лейбарысцкай (левыя).

Выбары-2001 у Брытаніі былі адначасова і звычайнымі, і асаблівымі. Асаблівасьць гэтая была выкліканая тым фактам, што сёньня краіна стаіць перад выбарам: далучацца да Эўрапейскага Грашовага Зьвязу й адмаўляцца ад уласнай грашовай адзінкі на карысьць эўра ці захаваць фунт. Справа ў тым, што пазыцыі асноўных партыяў па гэтым пытаньні супрацьлеглыя: у той час, як лейбарысты імкнуцца да як мага найшчыльнейшай інтэграцыі й жадаюць увесьці эўра, кансэрватары выступаюць катэгарычна супраць перадачы фінансавага сувэрэнітэту ў Брусэль і заклікаюць захоўваць фунт. Прычым па гэтым пытаньні 2/3 насельніцтва салідарныя з кансэрватарамі.

Але асноўнай мэтай нашага візыту было ўсё ж не знаёмства з палітычнай сыстэмай Вялікае Брытаніі, але атрыманьне практычнага досьведу па арганізацыі й правядзеньні перадвыбарчых кампаніяў. Менавіта таму мы й знаходзіліся ў штабе аднаго з кандыдатаў на поўдні Ангельшчыны.

Адразу хочацца сказаць, што нам вельмі пашанцавала зь людзьмі, якія дзяліліся з намі досьведам. Агентам па нашай акрузе (агент – гэта кіраўнік штабу й даверная асоба кандыдата) зьяўляецца Ўэндзі Бёчэл, выдатны мэнэджэр і арганізатар, жанчына, якая моцна верыць у кансэрватыўныя каштоўнасьці й прыйшла ў палітыку дзеля таго, каб змагацца за іх. Кандыдатам, а цяпер абраным сябрам парлямэнту ад акругі New Forest East ёсьць Джуліян Льюіс, выдатнейшы прамоўца, прафэсійны палітык, які мае вялікі досьвед правядзеньня рознага кшталту палітычных кампаніяў. Пра атрыманы досьвед канкрэтна й падрабязна я напішу ў наступных нумарах "Навінаў БНФ". Адзінае, на чым хацелася б засяродзіць цяпер увагу фронтаўскіх актывістаў – самым істотным кампанэнтам ёсьць абыход кватэраў. Кожны дзень, за выняткам нядзелі, зь 10.00 да 19.30 (натуральна, зь перапынкам на абед блізу адной гадзіны) усе актывісты й валянтэры абыходзяць дамы, даносячы да выбарнікаў пасланьне кандыдата й зьбіраючы інфармацыю аб іх настроях.



*Падчас падліку галасоў*

Праграма нашага візыту ў Вялікую Брытанію прадугледжвала таксама сустрэчы й удзел у брыфінгу для міжнародных назіральнікаў у Цэнтральным Офісе Кансэрватыўнае партыі ў Лёндане. Нам прадэманстравалі перадвыбарчыя ролікі кансэрватараў, распавялі пра агульнанацыянальную стратэгію перадвыбарчай кампаніі. Мы сустрэліся са спадарамі Майклам Трэндам і Рычардам Нормінгтонам, якія кіруюць міжнародным аддзелам Кансэрватыўнай партыі. Яны пажадалі дэмакратычным сілам Беларусі перамогі на восеньскіх выбарах і запэўнілі ў сваім жаданьні ўмацоўваць партнэрскія стасункі з БНФ.

Але самая істотная й значная сустрэча адбылася 1 чэрвеня, калі мы мелі гонар быць прадстаўленымі й размаўлялі са спадарыняй Маргарэт Тэтчар. Гэтая сустрэча адбылася ў суседняй акрузе, Ромзі, куды спн. Тэтчар прыехала, каб падтрымаць кандыдата ад кансэрватараў Пола Рэйнса. У размове з намі Маргарэт Тэтчар прадэманстравала, што дастаткова добра валодае інфармацыяй пра падзеі ў Беларусі, выказала шкадаваньне, што беларусы пакульня маюць належных свабодаў, перадусім свабоды слова й свабоды СМІ, а гэтаксама пажадала перамогі на восеньскіх выбарах.

**Аляксей ЯНУКЕВІЧ, сябра Сойму, сакратар міжнароднай камісіі Партыі БНФ**


vytoki.net

# Дзе і як знайсьці дабрахвотных памочнікаў

**Найлепшыя дабрахвотныя памочнікі для вашай кампаніі – гэта тыя людзі, якія ўжо выяўляюць палітычную актыўнасьць. На пачатку найлепш супрацоўнічаць з тымі людзьмі, якія выказалі жаданьне дапамагчы кампаніі на дабрахвотнай аснове.**

Найпрасьцей выявіць патэнцыйных актывістаў і дабрахвотнікаў у палітыцы, калі сам кандыдат дасьць вам сьпіс пэрспэктыўных людзей і арганізацыяў у тым раёне, дзе ён/яна абіраецца. Гэты сьпіс павінны быць як мага больш поўным. Ён можа улучаць такіх людзей і такія арганізацыі: былыя дабрахвотныя памочнікі кампаніяў; раённыя арганізацыі; групы, якія займаюцца зборам сродкаў; рэлігійныя арганізацыі; жаночыя арганізацыі; арганізацыі нацыянальных меншасьцяў; маладзёвыя аб'яднаньні; прафсаюзныя арганізацыі; экалягічныя арганізацыі; арганізацыі вэтэранаў; маладзёвыя групы дэмакратычнай арыентацыі; актывісты дэмакратычнай арыентацыі; арганізацыі пэнсіянэраў; спартовыя арганізацыі; грамадзкія арганізацыі; вашыя асабістыя сябры й сям'я і іншыя арганізацыі, якія не ўвайшлі ў гэты сьпіс, але падтрымліваюць вас.

Вашыя прыхільнікі у розных арганізацыях могуць прыцягнуць да працы людзей у філіях сваіх арганізацыяў у іншых гарадах або частках выбарчай акругі.

Пасьля выяўленьня патэнцыйных дабрахвотных памочнікаў і арганізацыяў каардынатар дабрахвотных памочнікаў павінны пераканацца, што дабрахвотнікаў запрасілі ўдзельнічаць у кампаніі. Тых памочнікаў, якія ўжо працуюць, можна папрасіць выступіць у ролі "вярбоўнікаў" дабрахвотнікаў з сваіх арганізацыяў. Людзі ахвотна адгукаюцца на просьбы сваіх калег, чым на просьбы чалавека з боку.

Кіраўнік кампаніі можа прыняць рашэньне арганізаваць камітэт дабрахвотных памочнікаў, каб дапамагчы каардынатару наладзіць кантакт з патэнцыйнымі памочнікамі (і патэнцыйнымі "вярбоўнікамі" дабрахвотнікаў). Каардынатар можа таксама прызначыць найбольш надзейных і арганізаваных памочнікаў сваімі намесьнікамі па вярбоўцы й працы з дабрахвотнікамі.

### Навучаньне "вярбоўнікаў" дабрахвотнікаў

Усе, хто займаецца наборам дабрахвотнікаў, павінны быць навучаныя адпаведнай мэтодыцы. У працэсе навучаньня неабходна: абмеркаваць плян набору дабрахвотнікаў; падлічыць, колькі дабрахвотнікаў спатрэбіцца; абмеркаваць, якой павінна быць іхная кваліфікацыя, прафэсія й г.д.; вырашыць, чым вы будзеце прыцягваць для кампаніі; правесьці ролевую гульню, у якой прайграюцца розныя сытуацыі набору людзей.

Супрацоўнікі, што займаюць ключавыя пазыцыі ў штаце кампаніі, павінныя наведаць гэтыя заняткі. Кіраўніку кампаніі трэба час ад часу ладзіць брыфінгі ды інфармаваць калег пра зьмены, якія адбыліся ў дзейнасьці й структуры кампаніі, пра праграмы, для якіх патрэбныя дабрахвотнікі (на брыфінгах павінныя прысутнічаць усе тыя, каго гэта тычыцца). У праграму навучаньня павінныя уваходзіць заняткі, на якіх тлумачылася б, як падтрымаць энтузіязм дабрахвотнікаў і як наладзіць пастаянна дзейную зваротную сувязь.

### Прыблізны плян заняткаў зь "вярбоўнікамі" дабрахвотнікаў

Заняткі зь "вярбоўнікамі" можна пабудаваць так:

– падзякаваць "вярбоўнікам"

– распавесьці пра стратэгію кампаніі. Неабходна дасягнуць таго, каб людзі, якія займаюцца наборам дабрахвотнікаў, адчувалі сваю далучанасьць да кампаніі й былі часткаю калектыву

– распавесьці пра чаканыя мерапрыемствы у межах кампаніі

– правесьці ролевую гульню, якая прайграе сытуацыі набору дабрахвотнікаў

– раздаць матэрыялы, якія вы падрыхтавалі для "вярбоўнікаў" і дабрахвотнікаў

– сказаць "вярбоўнікам", колькі дабрахвотнікаў яны павінныя набраць

– пакінуць час на пытаньні й адказы.

### Прыблізны пералік матэрыялаў, неабходных пры наборы дабрахвотнікаў

Перш чым што-небудзь рабіць, трэба пераканацца, што ў вашых дабрахвотных памочнікаў ёсьць усе неабходныя матэрыялы. Нават самыя простыя праекты патрабуюць інструкцыяў.

Прыкладам, калі вы плянуеце заняткі па наборы дабрахвотнікаў, накшталт прыведзеных вышэй, можна абапірацца на наступныя матэрыялы:

1. Плян сходу

2. Агульныя матэрыялы кампаніі (брашуры, налепкі, праграмныя дакумэнты, калі яны адпавядаюць сфэры дзейнасьці групы)

3. Пісьмовае апісаньне таго, што трэба рабіць і інструкцыі для "вярбоўнікаў"

4. Паэтапны (крок за крокам) плян праекту

5. Сьпіс вашых патэнцыйных дабрахвотнікаў

6. Прыблізны "агітацыйны" тэкст, што выкарыстоўваецца пры падборы дабрахвотных памочнікаў

7. Сьпіс магчымых пытаньняў, якія могуць задаць вам патэнцыйныя дабрахвотнікі, і адказы на іх

8. Сьпіс таго, што трэба рабіць з дапамогаю дабрахвотнікаў, з пазначэньнем датаў і часу, калі яны патрабуюцца. Завядзіце асобны аркуш паперы на кожны дзень мерапрыемства. Запішыце на гэтым аркушы імя й нумар тэлефону канкрэтнага чалавека, які адказвае за гэтую працу, і аддайце аркуш інфармацыю каардынатару дабрахвотнікаў

9. Індывідуальныя абавязальніцтвы (кожны дабрахвотнік бярэцца выканаць тую ці іншую працу, і ягоныя намеры фіксуюцца ў адмысловай картцы).

І, нарэшце, пераканайцеся ў тым, што падчас сходу былі паказаныя ўсе матэрыялы. Захоўвайце іх у адной тэчцы, каб яны не згубіліся.

Мэты кампаніі могуць запатрабаваць правядзеньня некалькіх заняткаў для розных групаў "вярбоўнікаў". Заняткі неабходна праводзіць у зручным месцы, а пасьля іх някепска было б арганізаваць прахаладжальныя напоі альбо якое-небудзь нефармальнае мерапрыемства – танцы, гарбату. За дзень да сходу каардынатару трэба абтэлефанаваць усіх дабрахвотнікаў, нагадваючы пра маючую адбыцца сустрэчу.

Адказным за правядзеньне набору дабрахвотнікаў варта карыстацца сьпісам сябраў арганізацыі ці сьпісамі прысутных на тых ці іншых мерапрыемствах пры разьмеркаваньні заданьняў дабрахвотнікам. Калі яны тэлефануюць патэнцыйным памочнікам, перад імі павінныя быць сьпісы заданьняў з датамі й часам правядзеньня мерапрыемстваў, каб тыя, хто пажадае пачаць працу не марудзячы, маглі адразу ж атрымаць заданьне. Адказныя за набор дабрахвотнікаў павінныя ўнесьці на адмысловую картку ўсю інфармацыю, якая ёсьць, улучна з часам, калі памочнік вольны й якой працай ён хацеў бы займацца.

**Падрыхтавалі Аляксей ЯНУКЕВІЧ і Сяргей КАНДРАТОВІЧ**

*(Далей будзе)*

vytoki.net

*Заканчэньне. (Пачатак у №№ 17, 18)*

# ШТО ДУМАЮЦЬ ЛІДЭРЫ?

Той факт, што 77,9% працаўнікоў дзяржсэктару ня верыць у магчымасьць павелічэньня да 2006 г. у 5 разоў сярэдняй зарплаты ў выпадку пераабраньня А. Лукашэнкі на пост прэзыдэнта, ёсьць яшчэ адным сьведчаньнем таго, што дзяржаўная эліта ня верыць афіцыйнай прапагандзе й вельмі цьвяроза ацэньвае становішча ў краіне (табл. 10).

Што тычыцца будучыні, г.зн. сваіх уласных пэрспэктываў і пэрспэктываў дзяцей, маем наступнае (табл. 11 і 12). Калі на выбарах пераможа А. Лукашэнка, дык, на думку апытаных, падставаў для аптымізму няшмат – блізу паловы рэспандэнтаў заявілі, што ў такім разе іхнае матэрыяльнае й сацыяльнае становішча пагоршыцца. Наступствы перамогі на выбарах дэмакратычнага кандыдата ацэньваюцца з большым энтузіязмам – пры такім раскладзе спадзяюцца на паляпшэньне свайго сацыяльнага й матэрыяльнага становішча 43,8%.

Больш палярна ў залежнасьці ад вынікаў выбараў лідэры й экспэрты ставяцца да пэрспэктываў сваіх дзяцей. Пры перамозе А. Лукашэнкі пра пагаршэньне такіх пэрспэктываў заявілі 56,3% (супрацьлеглы пункт гледжаньня выказалі 15%), пры перамозе дэмакратычнага кандыдата – 5% і 65% адпаведна (працаўнікі дзяржсэктару 12,9% і 41,9% ). Інакш кажучы, кансэрвацыя цяперашняга палітычнага рэжыму атаесамляецца элітай з адсутнасьцю пэрспэктываў і магчымасьці для самарэалізацыі ў моладзі.

Такім чынам, значная большасьць лідэраў грамадзкай думкі й экспэртаў набыцьцё Беларусьсю незалежнасьці ацэньваюць станоўча. Нацыянальныя інтарэсы ў іхным усьведамленьні – інтарэсы тыповай дзяржавы зь пераходнай эканомікай, якая знаходзіцца на стадыі ўмацаваньня дзяржаўнага сувэрэнітэту і мадэрнізацыі эканомікі. Пры гэтым прадстаўнікі дзяржаўных структураў робяць акцэнт на практычных momантах, а недзяржаўных – на каштоўнасных.

Эліта даволі стрымана ставіцца да магчымасьці вылучэньня зь ейных шэрагаў альтэрнатыўнага кандыдата ў прэзыдэнты. Галоўнай перадумовай для падтрымкі альтэрнатыўнага кандыдата намэнклятурай, на ейную думку, зьяўляецца станоўчая пазыцыя расейскага кіраўніцтва ў адносінах да гэтага кандыдата. А для перамогі на выбарах кандыдату ў прэзыдэнты, мяркуюць апытаныя, трэба йсьці да выбарца зь лёзунгамі пераважна эканамічнага характару.

Лідэры й экспэрты ня толькі адэкватна ацэньваюць сытуацыю, якая склалася ў стасунках паміж галінамі ўлады, але й лічаць, што яна павінна зьмяніцца, што парлямэнт і прэзыдэнт павінныя быць незалежныя адзін ад аднаго. Перамога А. Лукашэнкі на выбарах разглядаецца элітай у зьвязку зь ейнымі пэрспэктывамі, а асабліва пэрспэктывамі дзяцей, вельмі нэгатыўна. У той час як перамога дэмакратычнага кандыдата ёсьць падмуркам для памяркоўнага сацыяльнага аптымізму.

**НІСЭПД**

**Табліца 10. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Ці верыце Вы ў магчымасьць павелічэньня сярэдняй зарплаты да 2006 г. у пяць разоў у выпадку пераабраньня А. Лукашэнкі прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусь?", %**

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Працаўнікі дзяржсэктару | Працаўнікі недзяржсэктару |
|---|---|---|---|
| Так | 7,5 | 9,7 | 6,1 |
| Не | 87,5 | 77,4 | 93,9 |

**Табліца 11. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Як Вы лічыце, у выпадку перамогі на маючых адбыцца выбарах А. Лукашэнкі:" (%)**

| Варыянт адказу | Вашае сацыяльнае становішча | Вашае матэрыяльнае становішча | Пэрспэктыва ў Вашых дзяцей |
|---|---|---|---|
| **Усе апытаныя** | | | |
| Палепшыцца | 3,8 | 5,0 | 15,0 |
| Ня зьменіцца | 40,0 | 33,8 | 21,3 |
| Пагоршыцца | 46,3 | 52,5 | 56,3 |
| **Працаўнікі дзяржсэктару** | | | |
| Палепшыцца | 16,3 | 6,5 | 22,4 |
| Ня зьменіцца | 8,8 | 16,1 | 4,1 |
| Пагоршыцца | 7,5 | 6,5 | 8,2 |
| **Працаўнікі недзяржсэктару** | | | |
| Палепшыцца | 4,1 | 4,1 | 16,3 |
| Ня зьменіцца | 32,7 | 20,4 | 6,1 |
| Пагоршыцца | 61,2 | 69,4 | 73,6 |

**Табліца 12. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Як Вы мяркуеце, у выпадку перамогі на маючых адбыцца выбарах дэмакратычнага кандыдата:" (%)**

| Варыянт адказу | Вашае сацыяльнае становішча | Вашае матэрыяльнае становішча | Пэрспэктыва ў Вашых дзяцей |
|---|---|---|---|
| **Усе апытаныя** | | | |
| Палепшыцца | 43,8 | 43,8 | 65,0 |
| Ня зьменіцца | 28,8 | 23,8 | 8,8 |
| Пагоршыцца | 2,5 | 3,8 | 5,0 |
| **Працаўнікі дзяржсэктару** | | | |
| Палепшыцца | 19,4 | 19,4 | 41,9 |
| Ня зьменіцца | 25,8 | 35,5 | 16,1 |
| Пагоршыцца | 6,5 | 9,6 | 12,9 |
| **Працаўнікі недзяржсэктару** | | | |
| Палепшыцца | 59,2 | 59,2 | 79,6 |
| Ня зьменіцца | 30,6 | 16,3 | 4,1 |
| Пагоршыцца | — | — | — |



vytoki.net

*28 чэрвеня – гадавіна з дня сьмерці Янкі Купалы. Загадка гэтай сьмерці дасюль яшчэ не разгаданая. А 7 ліпеня – 119 гадоў з дня нараджэньня паэта. "Навіны БНФ "Адраджэньне" далучаюцца да ўшанаваньня памяці Песьняра.*

# Янка Купала і савецкая цэнзура

Узаемаадносіны Янкі Купалы і савецкай улады ад самага пачатку складваліся ня проста. Мелі месца і напружанасьць, і падазронасьць, і недавер, і цэнзурныя рэпрэсіі. Прыкладам, са зборніку "Спадчына", як выйшаў у 1922 годзе, а мусіў выйсьці на пару гадоў раней, з-за цэнзурных меркаваньняў былі зьнятыя вершы "Паўстань...", "Жыды", у вершы "Наша гаспадарка" з радкоў "І душыць кліч: ці доўга будзе нам заломам//Варшава панская і царская Масква" былі выкінутыя словы "царская Масква". Замест іх зьявілася шматкроп'е. Наклад першага нумару часопісу "Адраджэньне" (1922 г.), дзе быў надрукаваны верш "Перад будучыняй", амаль увесь сканфіскавалі. Часопіс больш не выходзіў. Пра публіцыстыку 1918-20 г.г. і не гаворым. Толькі ў 1993 годзе пасля доўгае забароны пабачыла яна сьвет.

У дадатку №1 да справаздачнага дакладу тав. Якшэвіча (30.03.1928), дзе сярод іншага, "межджу протчым", ішла гаворка й пра "Тутэйшых" (пра лёс п'есы падрабязна распавёў Расьціслаў Платонаў у газэце "Літаратура і мастацтва" (№45, 1995 г.)), зьмешчаны сьпіс твораў, што падпалі пад забарону Галоўліту. Пад №12: "Янка Купала – вершы "Чужым", "Над Нёманам" (НАРБ. Ф. 4, воп. 3, спр. 22, арк. 937). І пазначана прычына забароны: "шавінізм".

У часопісе "Полымя рэвалюцыі" (№3, 1932 г.) быў зьмешчаны артыкул Алеся Кучара пра творчы шлях Янкі Купалы. Крытык дае высокую ацэнку творчасьці паэта, наагул прыязна да яго ставіцца. Але давайце пачытаем дакладную Галоўліту датычную агляду крытычных матэрыялаў: "Артыкул А. Кучара пра творчы шлях Я. Купалы лье ваду на млын нацыянал-дэмократызму. У гэтым артыкуле А. Кучар да творчасьці Я. Купалы падыходзіць не гістарычна, а змазвае клясавую сутнасьць творчасьці, ня ўскрывае ў творчасьці Я. Купалы тых нацыянал-дэмократычных установак, якія Я. Купалу былі ўласьцівы на пэўным этапе...

...А. Кучар у сваім артыкуле робіць аб'ектыўна Я. Купалу нацыянальным гэроем...

...Вядома тое, што Я. Купала на другім этапе сваёй творчасьці знаходзіўся пад моцным уплывам нашаніўскай нацдэмаўскай ідэолёгіі, а таксама "Раскіданае гняздо" ніяк не зьяўляецца "перадавой, праграмнай п'есай", а фактычна нацыяналістычнай п'есай..." (НАРБ. Ф. 4, воп. 21, спр. 364, арк. арк. 54-55). Што тут ужо тады казаць пра "Тутэйшых"?! Ну а Кучар потым рэзка зьменіць сваё стаўленьне да Янкі Купалы ды разам з Л. Бэндэ будзе бэсьціць яго.

На пачатку 1933 г. зьяўляецца пастанова ЦК КП(б)Б "Аб фактах прасачваньня клясава-варожых, нацыянал-дэмакратычных уплываў у мастацкай літаратуры БССР", дзе ў пункце 5 чытаем: "...Тав. Галавачу П., прапусьціўшаму ў рэдагаваным ім зборніку (Т. VI) вершаў Купалы – рад адкрыта нацыяналістычных клясава-варожых твораў Купалы – пэрыяда, калі Купала ў сваёй творчасьці яскрава адбіваў нацыянал-дэмакратычныя ідэі, у асаблівасьці без рэдакцыйных заўваг і палітычнай іх ацэнкі, – абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем..." (НАРБ. Ф. 4, воп. 3, спр. 80, арк. 25(адв.)).

У 1936 г. у Маскве ў Дзяржаўным выдавецтве мастацкай літаратуры (парасейску – ГИХЛ) выйшла кніга вершаў Купалы "Под новым солнцем". Перад гэтым аўтар пісаў крытыку Яўгену Мазалькову (поўны тэкст ліста захоўваецца ў Дзяржаўным Літаратурным музэі Янкі Купалы – Ф.1, воп. 2, адз. зах. 79, арк. 1): "...Яшчэ вельмі прашу Вас высьветліць у Выдавецтве, чаму не высылаюць мне аўтарскіх экзэмпляраў "Под новым солнцем". Калі я быў у Маскве, мне сказалі ў Дзяржвыдавецтве, што іх накіравалі ў Лубянку ў экспэдыцыю" (Цікава, што б гэта азначала? – Э. К.).

Праз год (у 1937-м) у Маскве мусіла выйсьці яшчэ адна кніга – "Избранные произведения". Але... У лісьце да Мазалькова ад 01.02.1938 г. з Кіславодзку паэт піша: "...Сапраўды, з маёй кнігай атрымалася ніякавата! Вінаваты, мусіць, я сам, што часьцей не зазіраў у Маскву і не клапаціўся пра выпуск зборніку..." (ДзЛМЯнК. Ф. 1, воп. 2, адз. зах. 89, арк. арк. 1-2). А атрымалася вось што. Янка Купала прысьпешваў, бо выданьне кнігі зацягвалася: пераклады, карэктура... Ды здарылася новая бяда. Як згадваў пазьней рэдактар зборніку Я. Мазалькоў, пасьля таго, як вёрстка кнігі была нарэшце пасланая Купалу, прагледжаная ім і падпісаная да друку, па нейкай недарэчнай выпадковасьці (ці сапраўды так? Год усё ж 1937-ы. – Э. К.) увесь набор у друкарні рассыпалі. Зборнік давялося набіраць нанова, і выйшаў ён у 1938 годзе.

У паваенны час, як падлічыў д-р Станіслаў Станкевіч, з 520 Купалавых твораў дарэвалюцыйнага пэрыяду ў Збор твораў 1952-54 г.г. не ўвайшло больш за 150, а гэта складае амаль чацьвертую частку ад створанага Песьняром. Праўда, у трэцяе пасьля вайны выданьне ня трапілі толькі недзе 25 твораў.

Паводле Ст. Станкевіча, у паваенныя выданьні не патрапілі: "вершы, што наагул маюць зыркі нацыянальны характар і ў якіх паэт вылівае глыбокія і шчырыя патрыятычныя пачуцьці ("Папросту" і інш.); вершы, у якіх у вельмі панурых фарбах асэнсоўваецца нацыянальнае, сацыяльнае і палітычнае паняволеньне Беларусі ў царскай Расеі ("Забраны край" і інш.); вершы, у якіх гнеўна асуджаюцца царская Расея і панская Польшча як панявольнікі Беларусі, або ў якіх панявольнікі гэтыя не называюцца па імю, а адно згадваюцца агульна ("Сваякі", "Годзе" і інш.); вершы пра гістарычную мінуўшчыну Беларусі (паэма "На куцьцю", вершы "Брату-беларусу", "Зь мінулых дзён" і інш.); вершы, у якіх Купала моцна акцэнтуе велізарную ролю роднае мовы ў нацыянальным жыцьці народу і выступае ў ейнай абароне перад пасяганьнямі на яе заходніх і ўсходніх дэнацыяналізатараў ("Ворагам Беларушчыны", "Роднае слова"(1910) і інш.).

Такая "зачыстка" твораў Янкі Купалы мела на мэце паказаць Песьняра ня больш, як паэтам сярэдняга роўню, зьнішчыць ідэйную і мастацкую веліч нацыянальнага паэта, пакідаючы ў школьных хрэстаматыях пераважна, як адзначаў сам Купала, "дрындушкі" 1930-40-х г.г.

Цяпер выдаецца Поўны збор твораў Янкі Купалы ў 9 тамах. Маем спадзеў, што ён сапраўды будзе поўным.

**Эдвард КАРБАНОВІЧ**

НавіНЫ
БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 19 (52), 28 чэрвеня 2001 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нутранай дакумэнтацыі.

Адрас для ліставаньня: 220005, Менск, а/с 42, тэл/факс 284-50-12
E-mail: press_bnf@tut.by
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Апяксей Шэін

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia



vytoki.net